

## Юстына Огар

# НАШ КОЛАС

Наш Колас у вершах і калыханках,
Усход сонца прарочыць ён зранку,
А калі пашарэе і звечарэе,
То слова паэтава грэе.
Звініць тое слова жалейкай музыкі.
Пачуй ты яго- свет паэта вялікі.
Наш Колас па лесе з Міхалам вандруе,
І дзедка Талаш там з палякам ваюе.
Мужык- селянін на зямельцы працуе,
А дзядзька Антось човен дзедаў майструе.
Парэчча- чароўны куток- заве, кліча…
У творах паэта зямелькі аблічча.
Наш Колас ніколі не памірае,
Са мной, з чытачом, ад душы размаўляе.
Вось дзеці з цікавасцю зноўку чытаюць,
Як Сцёпка з Аленкай свой шлях выбіраюць…
А недзе ў вершы крыніца бруіцца,

І хлопчыку ў хаце сваёй не сядзіцца.
Там рэчка і лес яго клічуць, завуць,
І хвалі ракі недзе ціха плывуць.
Наш Колас у вершах і калыханках,
Усход сонца прарочыць ён зранку,
А калі пашарэе і звечарэе,
То слова паэтава грэе.

## Настаўнікі не паміраюць

Настаўнікі не паміраюць,
А з неба зоркамі глядзяць.
Іх душы ў вучнях ажываюць,
І думкі светлыя ляцяць.

Настаўнікі не паміраюць,
У дзецях бачыцца працяг,
Яны на ганку сустракаюць,
Яны ў сэрцах Млечны Шлях.

Настаўнікі не паміраюць,
Навука, мудрасць іх жыве.
Іх думкі ў галавах вітаюць,
І зоркі гаснуць у траве.

Настаўнікі не паміраюць,
Яны ў памяці, у нас.
Дабра і свету нам жадаюць
І кожны дзень, і кожны час.

Настаўнікі не паміраюць,
Нас акрыляюць дабратой…
Настаўнікі не паміраюць,
Яны жывуць са мной, з табой.